5. 4-ая ступень – низкая трудоспособность, неуравновешенность, агрессивность, спад успвеаемости, отказ выполнять требования учителя, создание конфликтных ситуаций. Выявлена у 3% учащихся (5 учащихся).

Результаты проведенной диагностики позволили выявить 53 дезадаптанта (35%). По результатам констатирующего этапа исследования нами составлен план коррекционной работы с выявленными дезадаптантами.

1. Сбор предварительных данных об ученике, их анализ.
2. Изучение ребенка с использованием методик по проблеме выявленной на диагностическом этапе.
3. Сопоставление полученных данных и определение возможных причин недостаточной успеваемости учения ребенка.
4. Выбор педагогических средств, обеспечивающих оптимальное развитие ученика и совершенствование его учебной деятельности.
5. Реализация выбранных педагогических средств.
6. Определение эффективности педагогического воздействия и его корректировка в соответствии с полученными результатами.

**Литература**


1. *Захаров А. И.* Как предупредить отклонения в поведении ребенка. – М., 1993.
2. *Коломинский Я. Л.* Социальная психология школьного класса. – Мн., 2003.
3. *Леонтьев А. Н.* Проблемы развития психики. – М., 1972.
4. *Овчаров Р. В.* Практическая психология в школе. –М., 2000


# ПЕДАГАГІЧНАЯ ДУМКА ГЕРМАНА ГЕСЭ (ПАВОДЛЕ РАМАНА «ГУЛЬНЯ ШКЛЯНЫХ ПЕРЛАЎ»)

**П. У. Куксанава**

У гэтым даследаванні я не стаўлю перад сабой мэты аналізу рамана Германа Гесэ як мастацкага твора: яго мастацкія вартасці бясспрэчныя. Я маю на мэце разгляд і інтэрпрэтацыю рамана як крыніцу педагагічных поглядаў і ідэй яго аўтара.

Для гуманіста Гесэ лёс навук і мастацтваў быў непарыўна звязаны з лёсам чалавецтва наогул, і гэтую непарыўную сувязь пісьменнік увасобіў у сваёй цудоўнай утопіі – Педагагічнай правінцыі Касталіі, а сваё разуменне навук і мастацтваў – у Гульні шкляных перлаў. На той час думка пра ўзаемасувязь навук і мастацтваў, відавочная ўжо для шматлікіх мастакоў і літаратараў, была новым словам у сферы адукацыі і выхавання духоўна багатай асобы. У многім дзякуючы Герману Гесэ, перакідванне масткоў паміж матэматыкай і музыкай, этнаграфіяй і

лінгвістыкай, псіхалогіяй і паэзіяй у навучальным працэсе цяпер ужо не мысліцца нечым неверагодным. Наадварот, пошук і правядзенне паралеляў, асацыяцый, узнікненне новых памежных дысцыплін – гэта цэлая з’ява у навуцы апошняга часу.

Гесэ быў напраўду заклапочаны станам духоўнасці ў грамадстве; і сучаснаму Гесэ перыяду аўтар у рамане дае найменне «фельетоннай эпохі», калі папулярнымі сталі такія жанры, як фельетон, анекдот, апытальнік, даклад, красворд, адным чынам – масавая літаратура і жоўтая прэса. Квітнела спекуляцыя духоўнасцю і дэвальвацыя слова.

Гульня шкляных перлаў стала спробай адукаваных людзей супраціўляцца абясцэньванню слова, прымітывізацыі культуры, здзеку з сапраўднае духоўнасці.

Напачатку гульня ўяўляла сабой старыя лічыльнікі з нанізанымі каралямі розных памераў і колераў, якія выконвалі функцыю нотаў. Такім чынам, можна было складаць з караляў музычныя цытаты і тэмы, змяняць іх, развіваць, транспанаваць і супастаўляць з іншымі. Пазней у сімвалічны код гульні дадаваліся знакі з іншых навук, якія абазначалі сабой тую ці іншую ідэю, тэму, мелодыю, закон, канцэпт.

Гульня шкляных перлаў грунтавалася на прынцыпах:

- Сінкрэтызму навукі і мастацтва
- Аб’ектыўнасці асацыяцый
- Добрасумленнасці гульцоў
- Універсальнасці і чысціні ведаў
- Сузіральнасці і медытацыі

Медытацыя, паводле рамана, – гэта комплекс дыхальных практыкаванняў, валявых, разумовых і фантазійных прыёмаў, накіраваных на засяроджанне, самапагружэнне і самаспазнанне.

Схема медытацыі з рамана:

Маруднае піццё малака → супакаенне → праслухоўванне музыкі → уяўленне гэтай музыкі як танцу → аўторнае праслухоўванне музыкі → засяроджанне → маляванне гэтай музыкі ў свядомасці → плін. праслухоўванне апошняй варыяцыі → маляванне вобразу гэтай музыкі на паперы → сон.

Гульня – гэта самы значны і самы шматзначны сімвал рамана. Гульня – гэта арэна для Духу. Гульня – гэта лад жыцця чалавека, які праз увесь час гуляе ў асацыяцыі, у ролі. Гульня – гэта аснова філасофіі постмадэрнізму. Такім чынам, Гульня шкляных перлаў – гэта сімвал свядомасці будучага пакалення інтэлектуалаў.

У педагагічным кантэксце Гульня ўспрымаецца як прынцып універсальнасці ведаў, узаемадапаўнення адной навукі іншаю. Гесэ ішоў

паперадзе свайго часу: ствараючы свой раман-алегорыю, ён прадбачыў сучасную тэндэнцыю ўзаемапранікнення навук, паўстання на грунце класічных галінаў ведаў новых памежных, інтэгральных дысцы

Герман Гесэ спадзяваўся, што дзяржава зверне сваю ўвагу на стан духоўнасці ў грамадстве, і гэтае сваё спадзяванне ўвасобіў у правінцыі Касталіі, рэзервацыі Духу, якая была створана і падтрымліваецца дзяржаўнымі ўладамі.

Назва Касталіі паходзіць ад назвы крыніцы на Парнасе, каля якой вадзіў карагоды са сваімі музамі бог-апякун навук і мастацтваў Апалон. Гесэ падкрэсліваў генетычную сувязь сваёй Касталіі з Педагагічнай правінцыяй Гётэ (раман «Гады вандровак Вільгельма Майстра», 1821), а вытокі Гульні шкляных перлаў бачыў у ідэях старажытных кітайцаў, індусаў, грэкаў і іншых філосафаў.

Касталія, паводле рамана, – гэта педагагічная правінцыя, якая знаходзіцца пад апекай Педагагічнага ведамства і Ордэна. У элітныя школы Касталіі адбіраюцца таленавітыя хлопчыкі 11-12 гадоў з усіх свецкіх школ паводле рэкамендацыі іх настаўнікаў, на што патрэбна згода вучня і ягоных бацькоў. Калі вучань не праваліцца на экзаменах, псіхалагічна не зламаецца ў адрыве ад сям'і і не будзе адасланы назад у свецкую школу, то ягонае навучанне заканчваецца прыкладна ў веку 23-25 гадоў прыняццем у Ордэн і накіраваннем на якую-кольвечы пасаду. З гэтага моманту сябру Ордэна даецца поўная воля навуковых зацікаўленняў: у ягоным распараджэнні вышэйшыя навучальныя ўстановы, бібліятэкі, архівы, лабараторыі. Пераважная большасць выхаванцаў Касталіі ідзе настаўнічаць у свецкія школы. Такім чынам, выхаванне і адукацыя ў краіне цалкам знаходзяцца пад аховай Педагагічнага ведамства.

Жыццё ў Касталіі падпарадкоўваецца наступным прынцыпам:

1. Невеляцыя індывідуальнасці, як мага большае падпарадкаванне асобы іерархіі Педагагічнага ведамства;
2. Сузіральнасць, узятая з духоўнага багажу педагогікі Усходу;
3. Чэрпанне сіл у медытацыі, у супакаенні, у прымірэнні розуму і душы;
4. Служэнне як ідэя і ідэальны стан душы кожнага касталійца;
5. Весялосць, прамяністасць як прынцып паводзінаў, прынцып жыцця, заснаваны на добразычлівасці, жыццярадаснасці;
6. Развіццё здольнасцяў, закладзеных у самой прыродзе дзіцяці;
7. Паглыбленне навукі і мастацтва, а не іх творчае развіццё, бо ўсялякае развіццё небяспечнае для чысціні Духу;
8. Адсутнасць фізічнага і працоўнага выхавання;

9. Пераемнасць, знітаванасць няўрымслівай маладосці вучняў і мудрай старасці настаўнікаў.

У сімвалах Гульні шкляных перлаў (выхаванні інтэлекту) і Медытацыі (выхаванні душы) Герман Гесэ ўвасобіў дзве асноўныя педагагічныя ідэі:

- Мысленне павінна быць чыстым, глыбокім, сінкрэтычным, універсальным.
- Душа павінна імкнуцца да ціхай весялосці, супакою, служэння Духу праз сузіральнасць, медытатыўнае паглыбленне ў сябе.

Як вынікае з рамана, Гесэ не прытрымліваўся канцэпцыі ўсебаковага развіцця асобы: у імя Духу касталійцы былі вымушаны адмовіцца ад сувязяў з бацькамі і жанчынамі, ад свецкіх радасцяў і дабрабыту, ад імкнення да славы і багацця. На думку Гесэ, паглыбленне ў сябе, у навуку, раставанне ў іерархіі, праўдзівае служэнне Духу – гэта і ёсць гарманічнае развіццё асобы.

Спецыфіка педагагічнай сістэмы Касталіі найлепей выражана ў наступнай цытаце: «Ён [вучань элітнай школы] не “абірае” прафесію. Ён не думае, што здольны меркаваць пра свае таленты лепей за свайго настаўніка. Ён знаходзіцца ўнутры іерархіі заўжды на тым месцы і прымае такое прызначэнне, якое абіраюць для яго старэйшыя, – калі не ўлічваць, што менавіта ўласцівасці, здольнасці і памылкі вучня вымушаюць настаўніка ставіць яго на тое ці іншае месца» [1, с. 74].

Такім чынам, Гесэ надзяляе настаўніка вельмі важнай роляй і адказнасцю – вырашаць лёс сваіх вучняў. Настаўнік для Гесэ не толькі той, хто дае веды, развівае здольнасці, выхоўвае свайго вучня, але і той, хто сваёй увагай, словам, клопатам, парадай дае яму дарогу ў жыццё, накіроўвае і блаславўляе яго.

Тэма настаўніка і вучня гучыць лейтматывам праз увесь раман. Настаўнік прыходзіць на дапамогу Вучню ў самыя цяжкія, пераломныя моманты жыцця, паказваючы прыклад, узгадваючы сваё юнацтва, ён дорыць Вучню сваю мудрасць і досвед, тым самым Настаўнік, беручы ад Вучня ягоныя перажыванні, хваляванні, перажывае іх нанова.

«…Гэты асэнсавана-бессэнсоўны колазварот Настаўніка і Вучня, гэтыя пошукавыя дачыненні маладосці і мудрасці, гэтая адвечная захапляльная гульня была сімвалам Касталіі, была гульнёй жыцця наогул, якая, раздвойваючыся на старасць і маладосць, на дзень і ноч, на Інь і Ян, доўжыцца бясконца» [1, с. 199].

На жаль, гесэўскае разуменне сувязі і стасункаў паміж настаўнікам і вучнем не знаходзіць падтрымкі ў сучасным грамадстве. Хочацца спадзявацца, што гэта з тае прычыны, што большасць не чытала Гесэ.

**Літаратура**

1. *Гессе Г.* Игра в бисер: Роман / Пер. с нем. С. Апта. СПб., 2005.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ АКТИВНЫХ ФОРМ И МЕТОДОВ ОБУЧЕНИЯ В СОЦИОЛОГИЧЕСКИХ ДИСЦИПЛИНАХ

**Е. В. Рогач**

В настоящее время все большее значение в процессе образования приобретают активные формы и методы обучения. В отличие от традиционных форм они в своем роде «вынуждают» обучаемых проявлять активность, т.е. объективно пропадает возможность «отсидеться». Также внедрение подобных форм и методов обучения способствует самостоятельной выработке решений, вовлечению учащихся в коммуникацию между собой и с преподавателем. Важным моментом является и усиление мотивации в обучении, что делает процесс обучения намного эффективнее. Кроме того, использование активных методов помогает в проявлении рефлексии, что выражается в самоанализе и работе над самооценкой. Немаловажно и то, что раскрытие неких талантов, творческих способностей во многом может быть достигнуто именно посредством таких, с первого взгляда необычных, форм и методов.

К активным формам и методам обучения можно отнести деловые игры, учебные дебаты, дискуссии, тренинги, проектирование, метод «мозгового штурма», коллаж и др.

Тема активизации активных форм и методов обучения, отличающихся от традиционной объясняющей модели, актуальна и для социологической науки, не только потому, что она непрерывно развивается и ищет новые способы для успешной реализации теории социологии в процессе преподавания, но и в силу специфики самой науки – структура социологии такова, что имеет не только общетеоретический уровень и уровень специальных социологических теорий, но и эмпирический уровень, включающий в себя именно активную практическую деятельность социологов. В качестве примера того, как положительно может измениться процесс обучения при изучении специальных социологических теорий можно привести организацию деловых игр, на первый взгляд не сочетающихся с обучением.

В социологии брака и семьи целесообразно проведение ролевой игры по презентации различных семейных ролей, обыгрыванию проблемных ситуаций в семьях разных типов (неполная, молодая, патриархальная и др.), оценке выполнения функций семьи и т.п. Эффект такой формы работы заключается не только в усвоении теории, но также и в формировании собственной позиции относительно своей семейной роли и статуса.